ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 22 (118) | Субота, 17 чэрвеня 1972 г. | Год выдання 3-ці | Цана 2 кап.

Дзённік сесіі

## ДЭБЮТ ЎДАЎСЯ

Абарона дыпломных праектаў. Гэта словазлучэнне для нашых філолагаў новае і нязвычнае. Што і казаць, хваляваліся выпускнікі, а таму доўга і старанна рыхтаваліся.

І вось надышоў хвалюючы дзень. Камісія ў складзе старшыні дацэнта Аляксандра Уладзіміравіча Царука, кандыдатаў філалагічных навук М. В. Родчанкі, М. А. Янкоўскага, М. Я. Ханіна, доктара гістарычных навук, прафесара І. Ф. Мужава, старшага выкладчыка Л. В. Цэхановіч занялі свае месцы.

За кафедрай дыпломнік Уладзімір Давыдаў. Спакойна і па-дзелавому фармулюе ён асноўныя палажэнні сваёй дыпломнай работы «Праблема экранізацыі літаратутрных твораў». На пытанні членаў камісіі Уладзімір дае поўныя і вычарпальныя адказы. Затым выступае кіраўнік дыпломнай работы, доктар філалагічных навук, прафесар П. П. Ахрыменка, які адзначае навізну і самастойнасць даследавання. Рэцэнзент кандыдат філалагічных навук Г. Д. Зялінская так сама высока ацэньвае работу У выніку члены камісіі аднадушна ставяць выдатную адзнаку.

Такой жа высокай ацэнкі ўдастоілася дыпломная работа Рыгора Нямцова «Р. Раждзественскі. Традыцыі і наватарства» (навуковы кіраўнік кандыдат філалагічных навук М. В. Родчанка). Вялікую цікавасць выклікалі таксама работы Святланы Стратовіч «Праблема станоўчага героя ў рускай дэмакратычнай літаратуры канца 50 — пачатку 60-х гадоў» (навуковы кіраўнік, кандыдат філалагічных навук М. А. Маляўка) і Таццяны Курынай «Мастацкія своеасаблівасці «Аповесці пра жыццё» Паўстоўскага» (навуковы кіраўнік, кандыдат філалагічных навук М. В. Родчанка). Вышэйшы бал, акрамя іх, атрымалі яшчэ 7 дыпломнікаў: Ніна Авакумава, Валянціна Асташонак, Алена Галкоўская, Людміла Курачэнка, Святлана Панькова, Таццяна Рытвінская, Вольга Бурая.

Гэта вынікі толькі аднаго дня абароны. Яны безумоўна радуюць. У наступныя дні таксама працягвалася абарона. І яна была паспяховай.

Пракаменціраваць вынікі першага дня абароны дыпломных работ ветліва згадзіўся загадчык кафедры рускай літаратуры доктар філалагічных навук, прафесар П. П. Ахрыменка:

— Абарона дыпломных работ праходзіць надзвычай паспяхова. Шэраг іх з'яўляюцца глыбока самастойнымі, арыгінальнымі. Асабліва хочацца адзначыць работы Ул. Давыдава, Р. Нямцова, С. Галай. Яны могуць пры ўмелым кіраўніцтве, пэўнай ініцыятыве, вялікай працы стаць трывалай асновай кандыдацкіх дысертацый.

В. МІКАЛАЕЎ.



НА ЗДЫМКУ: дзяржаўная экзаменацыйная камісія біёлага-глебавага факультэта ўважліва слухае адказы выпускнікоў.

## І РАДАСЦІ, І ТРЫВОГІ

Летняя экзаменацыйная сесія на біёлага-глебавым факультэце ў разгары. Напярэдадні яе ў студэнцкім калектыве праведзена значная падрыхтоўчая работа — адбыліся камсамольскія сходы, якія абмеркавалі гатоўнасць да сесіі. Гэтае ж пытанне было ў парадку дня курсавых сходаў.

Што ж паказвае сесія? Арганізацыйная дзейнасць дае нядрэнныя поспехі.

Добрыя веды паказваюць студэнты другой групы трэцяга курса. Складаная дысцыпліна «Фізіялогія чалавека і жывёл», але на гэтым экзамене рабяты і дзяўчаты паказалі ўпэўненыя веды. Толькі двое з іх атрымалі тройкі, у астатніх жа—выдатныя і добрыя адзнакі. Студэнты другой групы ўжо здалі экзамены па трох прадметах, і на кожным з іх паказалі сябе з лепшага боку. Што гэта так, сведчаць факты: у групе ніводнай нездавальняючай адзнакі, толькі некалькі троек, а Н. Кучаравенка, Л. Марозава і В. Сахно атрымалі ўсе пяцёркі.

Нядрэнна пачалі сесію ў другой групе 2 курса. На біяхіміі толькі Е. Гапеева, В. Данілкова і С. Тарасава атрымалі здавальняюча, у астатніх жа студэнтаў—чацвёркі і пяцёркі.

Але сёння неабходна гаварыць уголас не толькі аб нашых поспехах. Ёсць і няўдачы, якія засмучаюць, якіх магло і не быць.

Трэці курс, першая група. У ёй не зусім гладка прайшоў экзамен па фізіялогіі раслін. «Вызначыліся» Л. Фірсава і А. Хілько, якія атрымалі двойкі.

Я. ЛЯЛЬКОВА,
сакратар камсамольскай арганізацыі біёлага-глебавага факультэта.



НА ЗДЫМКУ: выдатную адзнаку па фізіцы атрымала студэнтка 3 курса механіка-матэматычнага факультэта Валянціна Красоўская.

## ПА УНІВЕРСІТЭТУ

### ДЗЕНЬ ПАРТЫЙНАГА РАБОТНІКА

Ва універсітэце адбыўся Дзень партыйнага работніка. Перад прысутнымі выступілі загадчык арганізацыйнага аддзела Чыгуначнага райкома КПБ Пётр Іванавіч Капялюш і інструктар Чыгуначнага райкома КПБ Канстанцін Васільевіч Усціновіч.

З вопытам работы падзяліліся сакратар партыйнай арганізацыі гісторыка-філалагічнага факультэта тав. У. В. Анічэнка і сакратар партыйнай арганізацыі фізічнага факультэта тав. В. М. Сабаленка.

З аналізам работы партыйных арганізацый факультэтаў выступіў сакратар парткома тав. У. В. Казлоў.

### ВУЧОНЫ САВЕТ

**13 чэрвеня адбылося чарговае пасяджэнне Вучонага савета універсітэта.**

**Аб стане абаронна-масавай работы ў пярвічнай арганізацыі ДТСААФ універсітэта далажыў старшыня пярвічнай арганізацыі ДТСААФ П. У. Жукаў.**

**Інфармацыю аб будаўніцтве аб'ектаў універсітэта зрабіў рэктар, акадэмік АН БССР У. А. Белы.**

**Пра арганізацыю новых кафедр універсітэта расказаў начальнік вучэбнай часткі В. В. Юфераў.**

**Вучоны савет абраў на вакантныя пасады па конкурсу прафесарска-выкладчыцкі састаў кафедр.**

**Па ўсіх абмеркаваных пытаннях былі прыняты адпаведныя пастановы.**

НА ЗДЫМКУ: першыя выпускнікі фізічнага факультэта, якія атрымалі вельмі цікавую і важную для народнай гаспадаркі спецыяльнасць радыёфізікаў.



